# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЯЕ ГІСТАРЫЧНЫЯ ВЫТОКІ

**А. І. Яновіч (Мінск)**

Характарыстыка сучаснай беларускай мовы як усходнеславянскай пацвярджаецца на падставе значнай сукупнасці ўласцівых ёй агульнаўсходнеславянскіх моўных рыс (пераважна фанетычных), да якіх адносяцца: поўнагалоссе, а таксама спалучэнні **ор**, **ол**, **ер** (з гукам [о] на месцы [е], [ь] перад [л]), гукі [ч], [ж] на месцы праславянскіх спалучэнняў *tj, *dj і *kt, gt перад галоснымі пярэдняга раду), гукі [у], [’а] на месцы насавых галосных, развіццё галосных [о], [е] на месцы рэдукаваных [ъ], [ь] у моцнай пазіцыі і страта ў слабой, пачатковае [о] на месцы [je]. Беларускай мове вядомы таксама і іншыя фанетычныя з’явы, якія ўласцівы не толькі ўсходнеславянскім, але і паўднёваславянскім мовам: групы **бл**, **вл**, **пл**, **мл** на месцы [бj], [мj], [вj], [пj]; гук [л] на месцы *dl, *tl; спалучэнні **ц'в'**, **з'в'** на месцы *kv, gv; частковае распаўсюджванне мае памякчэнне зычных перад [е], [і], прадстаўленае толькі ў беларускай, рускай і польскай мовах. Гэтыя рысы з’яўляюцца агульнаўсходнеславянскай моўнай спадчынай, якая склалася ў працэсе развіцця дыялектных асаблівасцей праславянскага перыяду. (Заўважым, што перасячэнне моўных ізаглос паміж асобных славянскіх груповак і нават паміж асобных усходнеславянскіх моў сведчыць пра тое, што выдзяленне ўсходнеславянскай моўнай і этнічнай групоўкі адбывалася не толькі ў выніку дыялектнага драблення агульнаславянскай мовы, але і ў працэсе пашырэння і перасячэння асобных праславянскіх дыялектных зон).

Многія рысы, якія збліжаюць усходнеславянскія мовы паміж сабой і адрозніваюць іх ад іншых славянскіх моў, узнікалі яшчэ ў праславянскую эпоху, але развіліся як агульныя ўсходнеславянскія з’явы пазней, пасля распаду агульнаславянскай сям’і.

На этапе, які храналагічна можна вызначыць як перыяд X–XIII стст., на аснове ўзаемадзеяння племянных дыялектаў усходніх славян склалася сукупнасць усходнеславянскіх гаворак гістарычнага часу, якую мы называем старажытнарускай мовай (надаючы слову **рускі** ў гэтым выпадку іншы сэнс у параўнанні з тым значэннем, якое яно набывае ў перыяд пасля XIV ст.). Адзінства старажытнарускай або агульнаўсходнеславян-

скай мовы забяспечвалася ўсходнеславянскай моўнай спадчынай дагістарычнага перыяду і шэрагам перажытых усходнімі славянамі агульных моўных навацый, да якіх адносяцца: страта насавых, страта слабых і развіццё моцных рэдукаваных у галосныя сярэдняга пад'ёму, у тым ліку ў спалучэнні з наступнымі плаўнымі ў закрытых складах; некаторыя агульныя працэсы ў галіне марфалогіі (пачатак уніфікацыі тыпаў іменнага скланнення на о і на u, уніфікацыі скланення поўных прыметнікаў і цвёрдага варыянту займеннікавага скланення). Гэтыя з'явы знаходзяць адлюстраванне ў пісьмовых помніках XI–XII стст. Фактарамі, якія спрыялі захаванню пэўнага адзінства старажытнарускай мовы ў гэты перыяд, былі такія культурна-гістарычныя фактары, як прыняццё адзінай праваслаўнай веры, адзіная літаратурная мова, якая ўзыходзіла да старажытнаславянскіх кніжных традыцый, адзіная дзяржаўная ўлада кіеўска-полацкіх князёў, несупынная цыркуляцыя насельніцтва па прычыне ажыўленых гандлёвых зносін поўначы з поўднем і частых ваенных паходаў.

Разам з тым пісьмовыя крыніцы агульнаўсходнеславянскай мовы, таксама як і яе далейшы гістарычны лёс, сведчаць пра наяўнасць дыялектных разыходжанняў у самы старажытны перыяд яе існавання. Можна сказаць, што ў яе нетрах ужо прысутнічалі перадумовы развіцця асобных моўных сістэм, што магло рэалізавацца, зразумела, толькі пры адпаведных сацыяльна-гістарычных абставінах. Да такіх з'яў адносіцца няўстойлівасць вымаўлення цвёрдага і мяккага [р], дыялектны характар заднеязычнага гука [г] (выбуховы або фрыкатыўны), гука [в] (губна-зубны або губна-губны), дыялектна абумоўленая якасць і ступень пашыранасці пратэтычных зычных ў пачатку слова, розныя шляхі развіцця гука [л], а таксама слабых рэдукаваных у спалучэнні з папярэднімі [р], [л] і моцных рэдукаваных у спалучэнні з [j], адсутнасць або наяўнасць памякчэння зычных перад галоснымі [і], [е], розная ступень рэдукаванасці галосных, розная ступень устойлівасці старажытных з'яў агульнаславянскай эпохі, перш за ўсё у галіне фанетыкі і марфалогіі. У выніку развіцця гэтых дыялектных асаблівасцей і ўзнікнення моўных навацый, у ходзе іх лакальнага размеркавання і пераразмеркавання складваліся асновы асобных усходнеславянскіх моў з іх адметнымі моўнымі рысамі. Значную ролю ў гэтым працэсе адыгрывалі падзеі сацыяльна-гістарычнага жыцця ўсходніх славян на паўднёвым захадзе і паўночным усходзе ў XIII–XIVстст. Гэта было стварэнне руска-літоўскай, а пазней літоўска-польскай дзяржавы, з аднога боку, з другога – адасабленне ад Кіева і аб'яднанне ўсходнеславянскіх зямель на поўначы і паўночным захадзе, звязанае з татара-мангольскім нашэсцем і яго наступствамі. На заходніх і

паўднёва-заходніх землях усходніх славян палітычнымі і культурнымі цэнтрамі былі старажытныя Полацк (Полотеск) і Тураў. Полацкае княства – адно з найбольш магутных дзяржаўна-феадальных княстваў Кіеўскай Русі, у яго склад уваходзілі таксама старажытныя Віцебск і Мінск (МѢнскъ). У межах Полацка-Мінскай зямлі і пачала складвацца беларуская народнасць і беларуская мова. З улікам сацыяльна-гістарычных фактараў гэты працэс вызначаецца як перыяд XIII–XIVстст., але зразумела, што многія моўныя з'явы, якія сталі адметнымі рысамі беларускай мовы, намнога больш старэйшыя і маюць вытокі ў глыбокай агульнаўсходнеславянскай і нават агульнаславянскай старажытнасці.

Пытанні гістарычнага развіцця мовы вырашаюцца ў арганічнай сувязі з пытаннямі яе дыялектна-арэальнай разнастайнасці.

Беларуская дыялектная мова – гэта сукупнасць двух асноўных дыялектаў – паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга (паміж імі знаходзіцца значная групоўка сярэднебеларускіх гаворак, якія маюць моўныя рысы гібрыднага характару). Галоўнымі моўнымі асаблівасцямі, па якіх проціпастаўлены дыялектныя сістэмы паўднёвага захаду і паўночнага ўсходу беларускай этнічнай тэрыторыі, з'яўляюцца (у галіне фанетыкі): 1) недысімілятыўнае (моцнае) аканне, яканне і часткова поўнае або няпоўнае оканне – дысімілятыўнае аканне, яканне; 2) закрыты гук [ê] на месцы Ѣ і закрыты гук [ô] на месцы этымалагічнага [о] у закрытым складзе – гук [е] на месцы Ѣ і гук [о] на месцы этымалагічнага [о] у закрытым складзе; 3) мяккасць і цвёрдасць зычных на месцы спалучэнняў з [j] або захаванне такіх спалучэнняў – падоўжаныя зычныя мяккія і цвёрдыя на месцы спалучэнняў з [j]; 4) зацвярдзелы [р] – наяўнасць цвёрдага [р] і мяккага [р’]. У галіне марфалогіі вельмі адметным выступае проціпастаўленне: канчатак **-е (-а)** у форме 3 ас. адз. л. дзеясловаў I спражэння – канчатак **–ець, -іць, (-ыць)** у 3 ас. адз. л. у дзясловаў I і II спражэння. Спалучэнне такіх дыялектных рыс у асноўным масіве беларускіх гаворак – гэта, з аднога боку, сляды дыялектных навацый старажытнага дапісьменнага перыяду, з другога – вынік рэалізацыі гістарычных заканамернасцей развіцця ўсходнеславянскіх дыялектных рыс на больш познім этапе, у пісьмовы перыяд, а таксама ў перыяд самастойнага існавання ўсходнеславянскіх моў. Па думцы даследчыкаў, асновы беларускага дыялектнага ландшафту закладваліся на працягу многіх стагоддзяў, у дакіеўскія часы, як адбітак старажытнай блізкасці этнічных груповак дрыгавічоў, радзімічаў і полацка-смаленскіх крывічоў на аснове іх ўзаемадзеяння з балцкім насельніцтвам. Прычынай выдзялення двух дыялектаў паслужылі міграцыйныя рухі ў паўночным і паўднёвым напрамку, у час фарміравання крывіцкага і дрыгавіцкага племянных саюзаў. Але канчаткова дыялектная

сістэма беларускай мовы склалася ў эпоху Вялікага Княства Літоўскага [8, с. 132–134].

З прычыны таго, што ў неспрыяльных гістарычных умовах былі перарваныя традыцыі старабеларускай пісьменнасці, сучасная (новая) беларуская літаратурная мова ўзнікла на народна-дыялектнай аснове. На першых этапах яе станаўлення значную ролю адыгралі паўднёва-заходнія гаворкі, пад уплывам якіх у якасці літаратурнай нормы замацаваліся такія формы 3 ас. адз. л. дзеясловаў I і II спражэння, як *нясе – косіць*, формы дав.-месн. склонаў мн. л. назоўнікаў мужч. р. з канчаткам **-ом**, **-ох** пад націскам і нек. інш. Пазней узрасла роля паўночна-ўсходніх гаворак, якія маюць шмат агульных рыс з рускай мовай і яе гаворкамі. Але асновай для выпрацоўкі норм беларускай літаратурнай мовы сталі сярэднебеларускія гаворкі (цэнтр. частка Мінскай вобл. і часткова ўсходнія раёны Гродзеншчыны). Немалаважную ролю адыграла і тое, што выдатныя беларускія мастакі слова (Багушэвіч, Цётка, Гартны, Бядуля, Купала, Колас) былі родам з цэнтральнай Беларусі.

Пад уплывам сярэднебеларускіх гаворак яшчэ ў пачатку XX ст. замацаваліся такія спецыфічныя рысы беларускай літаратурнай мовы, як поўнае недысімілятыўнае аканне, зацвярдзенне [р], шыпячых, [ц] этымалагічнага, губных зычных перад [j] і на канцы слова, чаргаванне складоў **ро-ры, ло-лы**, фрыкатыўнае [г], дзеканне, цеканне.

Такім чынам, спецыфіку сучаснай беларускай мовы, дыялектнай і літаратурнай, складаюць моўныя з'явы розных гістарычных пластоў як адбітак моўных працэсаў агульнаславянскай старажытнасці, як вынік моўных навацый эпохі дыялектнага члянення агульнаўсходнеславянскай мовы, як сведчанне рэалізацыі асобных напрамкаў развіцця моўных заканамернасцей, закладзеных у папярэднія перыяды.

I. 1. Да агульнаславянскай старажытнасці ўзыходзіць фрыкатыўны гук [г].

Першаснасць [g] адносна [g] фрыкатыўнага і развіццё апошняга па прычынах фізіялагічнага і фаналагічнага характару звычайна не выклікае сумнення. Але ў сучаснай славістыцы вядомыя супрацьлеглыя думкі адносна часу ўзнікнення [g] фрыкатыўнага: было гэта дыялектнай з'явай агульнаславянскага перыяду ці яго трэба аднесці да эпохі развіцця асобных славянскіх моў. На карысць першага сведчаць факты, на якія указвае Ф. П. Філін – гэта, у першую чаргу, кампактнасць распаўсюджвання [g] фрыкатыўнага або [h] па славянскіх мовах: у беларускай, украінскай, паўднёвай частцы рускіх гаворак, чэшскай, славацкай, верхне-лужыцкай, у заходніх гаворках славенскай мовы, што складае цэнтральнаславянскую зону. Такой жа кампактнай выглядае тэрыторыя

распаўсюджвання гэтай з'явы ва ўсходніх славян. Да таго ж прымаецца пад увагу, што страта затвора ў выбуховага [g] адбывалася паступова. Таму як верагоднае можна прыняць дапушчэнне, што яшчэ ў агульнаславянскую эпоху ўсходнеславянская моўная вобласць падзялілася па вымаўленню [g] выбуховага або фрыкатыўнага на дзве вялікія дыялектныя зоны: паўночную і паўднёвую [13, с. 255].

Агульнавядома таксама, што гэтая фанетычная з'ява з цяжкасцю атрымлівае адлюстраванне на пісьме. У самых ранніх помніках беларускай письменнасці (з XIV ст.) на такія факты ўказвае абазначэнне выбуховага [г] праз кг: *Жикгимонтъ* у адрозненне ад фрыкатыўнага, які перадаваўся праз г. У сучаснай беларускай мове захаваўся выбуховы [г] у некалькіх запазычаных словах: *гузік*, *ганак*, *гонт*, *гарнец* або ў спалучэнні зг: *мазгі*, *розгі*.

2. Да ліку старажытных дыялектных рыс агульнаўсходнеславянскай мовы ў пачатку яе станаўлення мы адносім аканне, найхарактэрнейшую рысу беларускай мовы. Але трэба адзначыць, што гісторыя гэтай з'явы не можа лічыцца канчаткова высветленай.

У шматгадовай гісторыі вывучэння акання на сённешні дзень выразна акрэсліліся два супрацьлеглыя меркаванні. Першае зыходзіць з думкі, што аканне ўзнікла ў выніку рэдукцыі (колькаснага пакарачэння) ненаціскных галосных. Лагічным працягам гэтага палажэння з'яўляецца сцверджанне першаснасці дысімілятыўнага акання і, як правіла, адмаўленне старажытнасці самой з'явы акання, якая аб'ектыўна магла развівацца толькі ў эпоху знікнення рэдукаваных [ъ], [ь]. Такі падыход распрацоўваецца, пачынаючы з работ А. А. Шахматава, у даследаваннях А. А. Патэбні, Я. Ф. Карскага, Я. В. Воўк-Левановіча, Р. І. Аванесава і яго гісторыка-дыялекталагічнай школы.

Другая гіпотэза паходжання акання (першпачаткова выказаная таксама А. А. Шахматавым, а ў далейшым Н. Ван-Вейкам, Ф. П. Філіным, А. Вайянам, В. Георгіевым) зыходзіць са сцвярджэння пра наяўнасць у агульнаславянскай мове лабіялізаванага галоснага [е], у самім характары якога была закладзена магчымасць яго дваістага развіцця – узмацненне лабіялізацыі або страта яе ў ненаціскных складах (у выніку аслаблення напружанасці). Так фарміравалася моцнае аканне, а розныя тыпы дысіміляцыі галосных ненаціскных і націскных складоў развіваліся ў выніку развіцця экспіраторнага націску і страты рэдукаваных. Ф. П. Філін вызначае эпоху ўзнікнення акання ў проціпастаўленні оканню перыядам VII–VIII стст. і лічыць, што гэтая з'ява адбывалася ў цэнтральнай паласе ўсходнеславянскай тэрыторыі ад вяцічаў на ўсходзе да радзімічаў і дрыгавічоў на захадзе [13, с.147]. Але ў пісьмовых крыніцах

аканне адлюстравана слаба, у выглядзе памылак і апісак, што лёгка зразумець, маючы на ўвазе окаючыя арфаграфічныя традыцыі старажытнаславянскага пісьма. У старабеларускіх помніках гэта з'ява адбіваецца толькі пачынаючы з XV ст.: *актября*, *апасле*, *Радимин* (судовыя кнігі і граматы XV ст.). У помніках XVI–XVII стст. такія прыклады больш шматлікія.

3. Следам глыбокай агульнаславянскай старажытнасці выступае наяўнасць у беларускай мове спалучэння **кв** – у словах с коранем **квет-**: *кветка*, *квітнець*, *квіценне*. Традыцыйна ў славістыцы лічыцца, што ўсходнім славянам уласціва памякчэнне заднеязычнага ў спалучэннях *kv-, *gv-. Таму гэты факт беларускай мовы (як і ўкраінскай) тлумачыцца заходнеславянскім уздзеяннем. Але наяўнасць слоў з коранем **кв-** і **гв-** у рускіх гаворках далёка на ўсходзе памяншае верагоднасць такога тлумачэння. Проціпастаўленне *kv-*cv- адносіцца да той пары, калі дыялектнае чляненне агульнаславянскай мовы не супадала з пазнейшымі моўнымі групіроўкамі. Але можна думаць, што арэалам захавання архаічных спалучэнняў з заднеязычнымі быў захад, у кірунку на ўсход гэтая з'ява затухала.

II. Больш познімі па часе ўзнікнення былі рысы беларускай мовы, якія можна супаставіць з перыядам фарміравання агульнаўсходнеславянскай мовы, але да страты рэдукаваных.

1. Заметнай рысай беларускага кансанантызму (як і ўкраінскага) з'яўляецца наяўнасць білабіяльнага гука [w], які выразна вымаўляецца як [ў] у слабых пазіцыях перад зычнымі або на канцы слова: *кароўка*, *кароў* (пар. [в] у слове *карова*). Гэтая рыса вядомая і паўднёвай частцы рускіх гаворак. Даныя гістарычнай дыялекталогіі сведчаць, што ўжо з XI ст. усходнеславянская моўная тэрыторыя зведала падзел на дзве зоны: паўночны захад з [в] губна-зубным (у помніках гэтай тэрыторыі не адзначана мена літар **в** і **у**) і паўднёвы захад з [w] білабіяльным: у помніках гэтай тэрыторыі даволі рана адзначаецца такая мена, якая з XIII ст. становіцца звычайнай з'явай, у тым ліку ў беларускіх помніках: *оуздумалъ*, *оу ризѢ* (Смал. гр. 1229 г.) і інш. Гісторыя проціпастаўлення [в] губна-зубнога і [w] білабіяльнага на ўсёй славянскай тэрыторыі яшчэ недастаткова вывучана, але магчыма, што гэтая з'ява ўзнікла раней эпохі агульнаўсходнеславянскай моўнай еднасці.

2. Гук [ў] вымаўляецца ў беларускай мове на месцы старажытнага спалучэння *tъlt* (*доўг*, *стоўб*). Адсутнасць пераходу ў пазіцыі перад галосным (*голка* < * *jьgъlъka*, *стол* <**stolъ*) указвае на тое, што гэтая змена адбывалася ў выніку лабіялізацыі плаўнага ў закрытым складзе да падзення рэдукаваных [2, с.86]. Калі прыняць пад увагу, што лабіялізацыя

плаўнага – гэта праяўленне таго ж працэсу, што мела месца пры развіцці другога паўнагалосся, то пачатак гэтай змены, якая ахапіла ўвесь усходнеславянскі паўднёвы захад, узыходзіць да XIII ст. Але ў беларускіх помніках гэты працэс як мена літар л і в адлюстроўваецца толькі з XV ст.: *невдовзѢ* (Чэцця 1489). Адзначым, што характэрнае для беларускай мовы вымаўленне [ў] у дзеяслоўных формах мінулага часу (*браў*, *насіў*) разглядаецца як з'ява нефанетычная. Яна развілася пад уздзеяннем дзеепрыметнікавых форм мінулага часу мужч. р. на **-въ** (*бравъ*, *носивъ*), якія выконвалі ролю другараднага выказніка і таму зближаліся з дзеепрыметнікамі на *-l* [13, с. 333].

3. Старажытнай спадчынай дагістарычнага перыяду агульнаўсходнеславянскай мовы з'яўляецца зацвярдзелы [р], уласцівы беларускай літаратурнай мове і большай частцы беларускіх гаворак. Гэтая з'ява атрымала тлумачэнне як вынік запазычання з польскай мовы ў працэсе этнаграфічнай асіміляцыі польскіх і беларускіх плямён [14, с. 316]. Сучасныя славісты звязваюць гэтую з'яву з агульным зацвярдзеннем зычных перад галоснымі пярэдняга раду, якое развівалася на тэрыторыі ўсходнеславянскага паўднёвага захаду і ахапіла дыялекты, на аснове якіх фарміраваліся моўныя рысы беларускай і ўкраінскай народнасцей [6, с.186]. Пэўныя прыклады зацвярдзерага [р] знаходзім у беларускіх помніках ад XIV ст.: *сентебра* (Гр. 1395), *трох* (Зб. XVст.).

4. У літаратурнай і дыялектнай беларускай мове (як і ва ўкраінскай) вядома афрыката [дж]: *агароджа*, *дождж*, *сяджу*, якая адпавядае старажытнаму рэфлексу праславянскіх спалучэнняў *dj, *zdj, *zgj, *zg'. Помнікі паўднёва-заходняй Русі, пачынаючы з самых старажытных, перадаюць гэтую афрыкату праз напісанне **жч**, **дж**. Так ў заходнерускай грамаце 1359 г. чаргуюцца напісанні *Ѣждчивалъ* і *Ѣзджывалъ*. Праўда, трэба прызнаць, што дзеяслоўныя формы тыпу *сяджу*, *хаджу* наўрад ці могуць сведчыць на карысць таго, што [дж] у гэтых выпадках непасрэдна ўзыходзіць да агульнаславянскага *dj. Пэўную ролю ў захаванні [дж] адыгрывае кантамінацыя, аналогія, а таксама факт лексікалізацыі асобных форм са звонкай афрыкатай.

5. У галіне марфалогіі адной са старажытных па паходжанню рыс з'яўляецца ўжыванне форм 3 ас. адз. л. дзеясловаў I спр. без канчатка (*нясе*, *піша*), уласцівае сучаснай беларускай літаратурнай мове і характэрнае для значнага масіву паўднёва-заходніх беларускіх гаворак. Вядома, што формы без канчатка адзначаны ў першых старажытнарускіх помніках, а іх размеркаванне сведчыць, што агульнаўсходнеславянская мова ў старажытную эпоху па ўтварэнню форм з канчаткам і без канчатка распадалася на два дыялектныя арэалы: паўночна-ўсходні, дзе формы без

канчатка не ўжываліся, і ўся астатняя тэрыторыя, дзе суіснавалі формы з канчаткам і без яго. Пачынаючы з XIII ст. назіраецца пашырэнне форм з канчаткамі **-тъ** або **-ть**, а для беларускіх пісьмовых помнікаў звычайным становіцца ўжыванне канчатка **–ть**. На першым этапе станаўлення новай літаратурнай мовы пад уплывам паўднёва-заходніх гаворак у якасці літаратурнай нормы замацавалася ўжыванне форм 3 ас. адз. л. без канчатка, якія ўзыходзяць да агульнаўсходнеславянскай эпохі.

6. Беларуская мова, як і ўкраінская, захавала старажытнае чаргаванне заднеязычных са свісцячымі ў складзе дав.-месн. склонаў назоўнікаў (пераважна жаночага роду): *у дарозе, на рацэ*. Вылучэнне дыялектнай зоны на поўначы, дзе развівалася абагульненне асноў на заднеязычныя, вызначылася ўжо на першым этапе існавання агульнаўсходнеславянскай мовы, не пазней XI ст. Гэтае новаўтварэнне пашыралася на поўдзень вельмі запаволена і наблізілася да беларускіх і ўкраінскіх зямель тады, калі ўжо склаліся беларуская і ўкраінская мовы як самастойныя [13, с. 383].

III. Разгледжаныя беларускія моўныя рысы прадстаўляюць сабой спадчыну агульнаўсходнеславянскай старажытнасці і, як правіла, аб'ядноўваюць беларускую мову з украінскай. Больш познімі па паходжанні ў параўнанні з разгледжанымі з'яўляюцца рысы сучаснай беларускай мовы, якія фарміраваліся ў эпоху страт рэдукаваных і як наступствы гэтай страты.

1. Характэрнай рысай сучаснай беларускай мовы з'яўляецца чаргаванне націскных **ро**, **ло** з ненаціскнымі **ры**, **лы**, **лі** на месцы стражытных спалучэнняў плаўных тыпу *trъt, *trьt, *tlъt, *tlьt: *кроў – крыві, глотка – глытаць*. Гэта засведчыла асаблівы шлях развіцця спалучэнняў плаўных з рэдукаванымі на тэрыторыях паўднёвага захаду (у параўнанні з тэрыторыяй паўночна-ўсходняга дыялектнага арэалу) шляхам страты рэдукаваных у слабой пазіцыі. У такіх спалучэннях плаўныя, набываючы складовасць, вакалізаваліся, а пасля страты складовасці плаўных развіваліся галосныя [ы], [і] (верхняга пад'ёму ў адрозненне ад развіцця галосных сярэдняга пад'ёму ў дыялектах паўночнага ўсходу). У помніках паўднёвага захаду напісанні **ры**, **лы** адзначаны з XIII ст., у старабеларускіх помніках – з XV ст.: *дрыжаху* (Чэцця 1489 г.). Сустракаюцца ў старабеларускай пісьменнасці напісанні тыпу *крви, трвати* (Зб. XVI ст.), якія можна тлумачыць як сведчанне складовасці плаўных (хоць такое меркаванне не лічыцца бясспрэчным).

Адзінкавыя заўвагі можна зрабіць ў адносінах да спалучэнняў рэдукаваных з плаўнымі тыпу *tъrt, *tъlt, *tьrt, *tьlt. Побач з фанетычна заканамерным развіццём рэдукаваных ў поўныя галосныя сярэдняга

пад'ёму (*верх*, *доўг*) у некаторых каранях адбылося развіццё галосных [ы], [і]: *тыркаць* < аг. ус. сл. *търкати*, *пырхаць* < *пърхати*, *чырвоны* < *чьрв-*.

2. Са стратай рэдукаваных звязана такая спецыфічная рыса паўднёва-заходніх беларускіх гаворак, як вымаўленне дыфтонгаў [уо], [іе] у новых закрытых складах у выніку падаўжэння спрадвечных галосных [о], [е]: [куон'], [с'іем]. Гэтая асаблівасць вакалізма ў беларускай літаратурнай мове не адбілася (хоць у той жа час шырока развілася і прадстаўлена ва ўкраінскай мове, дыялектнай і літаратурнай).

3. Адметнай рысай сучаснай беларускай мовы з'яўляецца вымаўленне галосных верхняга пад'ёму [ы], [і] на месцы старажытных рэдукаваных [ы], [и]: *шыя* < **šija*, *худы* < *chudyjь*. Гісторыя гэтай з'явы звязана з гісторыяй рэдукаваных [ъ], [ь], пазіцыйнымі варыянтамі якіх (у спалучэнні з [j]) былі рэдукаваныя [ы], [и] агульнаўсходнеславянскай пары. Своеасаблівасць іх развіцця была абумоўлена тым, што яшчэ напярэдадні страты рэдукаваных спалучэнні [ьj], [ъj], [іj], [ыj] мелі розныя адценні ў вымаўленні па асобных дыялектах, а таксама ў розных лексіка-граматычных групах слоў. Вынікам гэтага было поўнае супадзенне рэдукаваных [ы], [і] з рэфлексамі рэдукаваных ъ, ь на на паўночным усходзе ўсходнеславянскіх зямель (пар. руск. *шея*, *худой*). Процілеглы вынік развіцця атрымалі гэтыя рэдукаваныя на паўднёвым захадзе, дзе яны ў сувязі з аслабленнем [j] змяніліся ў галосныя верхняга пад'ёму [ы], [і]. Пры гэтым пазіцыя [j] выявіла асаблівую ўстойлівасць у складзе іменных асноў (бел. *салавей*, як і руск. *соловей* < аг. усх. сл. *соловии* < * *solvьjь*).

4. Своеасаблівыя вынікі атрымала ў беларускай мове развіццё новых спалучэнняў зычных з [j], якія ўзніклі пасля страты рэдукаванага перад [j] і ў сучаснай беларускай літаратурнай мове прадстаўлены падоўжанымі мяккімі або зацвярдзелымі зычнымі: аг. усх. сл. *житие*, *зелие*, *воочию* – бел. *жыццё*, *зелле*, *уваччу* і інш.

У пісьмовых помніках гэтая з'ява знаходзіць адлюстраванне толькі з XV–XVI стст.: *Иллиничы* (1457), *росказаннем* (1585), магчыма, у сувязі з нераспрацаванасцю арфаграфічных прыёмаў перадачы жывога вымаўлення.

У беларускай дыялектнай мове вядомы таксама іншыя рэфлексы гэтых спалучэнняў: або вымаўленне мяккіх і зацвярдзелых непадоўжаных зычных як вынік сцяжэння падоўжанага ([судз'á], [нóчу] або захаванне спалучэнняў зычных з [j] ([палóз'йе], [судз'йа]). Гэтая рыса ўласціва паўднёва-заходняму дыялекту беларускай мовы ў адрозненне ад паўночна-усходняга з падаўжэннем зычных. Рэфлексы новых спалучэнняў з [j] аказаліся пашыранымі і за межамі этнічнай тэрыторыі Беларусі (на захадзе вялікарускіх гаворак, ва ўкраінскіх гаворках), але цэнтрам іх

узнікнення лінгвісты лічаць паўднёва-заходні дыялект агульнаўсходнеславянскай мовы. Наяўнасць спалучэнняў з [j] у цэнтральнай частцы беларускіх гаворак тлумачыцца іх больш познім паходжаннем.

5. Найхарактэрнейшая асаблівасць беларускага кансанантызму – дзеканне і цеканне, г. зн. вымаўленне [д'], [т'] як [дз'], [ц'] ([з'], [с']) перад галоснымі пярэдняга раду, перад мяккімі зычнымі і ў канцы слова: *дзеці*, *цела*, уласцівае як літаратурнай мове, так і большай частцы беларускіх гаворак (за выключэннем паўднёва-ўсходніх і паўднёвых акраінных гаворак). Даследчыкі лічаць, што афрыкаты [дз'], [ц'] па сваёй фанетычнай прыродзе з'яўляюцца такімі ж гукамі [т'] і [д'], бо вымаўляюцца пры тым жа палажэнні языка (з прыцісканнем спінкі языка да альвеол верхніх зубоў), але з больш напружанай і падоўжанай артыкуляцыяй, што і вядзе да ўтварэння вузкай шчыліны паміж языком і верхнімі зубамі, г. зн. утварае зубны свісцячы прыгук [6, с.177]. Гэтай рысай фанетычны склад беларускай мовы набліжаецца да польскай, хоць у сучасным беларускім вымаўленні няма таго шыпячага прыгуку, які характарызуе польскае дзеканне і цеканне. Афрыкаты [дз'], [ц'] маглі развіцца толькі пасля памякчэння паўмяккіх зычных як своеасаблівая лакальная рэалізацыя проціпастаўлення цвёрдасці-мяккасці зычных. А. А. Шахматаў у свой час выказаў думку пра „ляшскае" паходжанне дзекання і цекання ў сувязі з мяркуемай асіміляцыяй „ляшскіх" плямён усходнеславянскім насельніцтвам (на падставе добра вядомага летапіснага запісу пра Радзімічаў „отъ рода Ляховъ"). Але гэта ўзводзіць узнікненне дзекання і цекання да той пары, калі паўмяккія зычныя яшчэ не зазналі памякчэння, што пазбаўляе гэта меркаванне верагоднасці.

Другі погляд на гісторыю гэтай з'явы, распрацаваны Я. Ф. Карскім, Б. де Куртэнэ, П. А. Растаргуевым, сведчыць, што дзеканне і цеканне ўзнікла на беларускай глебе самастойна, не пазней XIV ст., а кантакты беларускай мовы з польскай, якой уласціва падобная, хоць і не зусім тоесная моўная з'ява, толькі падтрымлівалі яе. Але гэта не азначае магчымасці бачыць ў яе развіцці польскі ўплыў: наяўнасць дзекання і цекання характарызуе ўсю беларускую тэрыторыю, а не толькі яе заходнія рэгіёны; да таго ж прызнанне польскага ўплыву паставіла б пытанне, чаму не былі засвоены іншыя фанетычныя рысы польскай мовы [6, с.174 – 179].

Беларускія афрыкаты знаходзяць сваё адлюстраванне ў заходнерускай пісьменнасці толькі з XV ст.: *людзи* (Гр. 1409 г.), *метаци*, *дзедзич* (Літ. метр. XVI ст.) і некаторыя іншыя нешматлікія прыклады. Магчыма, сама па сабе фрыкацыя [д'], [т'] развілася паступова, да таго ж арфаграфічныя традыцыі не садзейнічалі яе пісьмоваму абазначэнню, таксама як

імкненне адрозніць беларускае пісьмо ад польскага ў сітуацыі агульнага пашырэння польскага культурнага ўплыву.

IV. Пры значным і бясспрэчным адзінстве моўнай сістэмы старажытных усходніх славян усё ж на працягу доўгага гістарычнага развіцця накопліваліся складаныя і асобныя для розных усходнеславянскіх тэрытарыяльных адзінак комплексы дыялектызмаў, якія у сувязі з сацыяльна-гістарычнымі падзеямі XIII–XIV стст. набывалі значэнне адметных моўных прымет. Познія навацыі пашыраліся, у асноўным, у межах тэрыторыі кожнай народнасці, паглыбляючы дыферэнцыяцыю моўных сістэм. Такім чынам, пачынаючы з XIII–XIV стст. моўнае адрозненне паміж асобнымі ўсходнеславянскімі тэрыторыямі зазнае значныя змены ў параўнанні з папярэднім перыядам і выступае як важнейшая перадумова складання асобных усходнеславянскіх моў. Такімі бачацца гістарычныя вытокі беларускай мовы як самастойнай усходнеславянскай мовы.

**Літаратура:**


1. БУЗУК, П. А.: Взгляды акад. Шахматова на доисторические судьбы славянства.– Изв. ОРЯС, т. 23, кн.2 (1918), 1921.
2. БУЗУК, П. А.: Становішча беларускай мовы сярод іншых славянскіх моў. – Працы акадэмічнае канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі. Мінск, 1927.
3. БУЗУК, П. А.: Спроба гісторыі дагістарычнай эпохі славянскай фанетыкі. Ін-т беларускай культуры. Зап. аддзела гуманітарных навук, вып. 2. Мінск, 1928.
4. Вайтовіч, Н. Т.: Да пытання аб паходжанні беларускага дзекання і цекання. – Вучоныя зап. (Мінскі дзярж. пед. ін-т), вып. 1, 1950.
5. ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧ, Я. В.: Беларускае аканне. Мінск, 1926.
6. ВОЎК-ЛЕВАНОВІЧ, Я. В.: Лекцыі па гісторыі беларускай мовы.– Мн., 1994.
7. КАРСКИЙ, Е. Ф.: Белорусы. Язык белорусского народа. Вып 1. М. 1955. Вып.2–3. М., 1956.
8. КЛІМЧУК, Ф. Д.: Гістарычная дыялекталогія.– Беларуская мова. Энцыклапедыя. Мн., 1994.
9. КОРНЕЕВА-ПЕТРУЛАН, М. И.: К истории отдельных фонетических особенностей белорусского языка.– Даследаванні па беларускай і рускай мовах. Мінск, 1958.

10. Б. ДЕ КУРТЕНЭ, И. А.:. Лингвистические заметки и афоризмы. По поводу новейших лингвистических трудов В. А.Богородицкого.– Журнал Мин-ва нар. просвещения. 1903, ч. 346, апрель, ч. 347, май.
11. ПОТЕБНЯ, А. А.: К истории звуков русского языка. Воронеж, 1876.
12. РАСТОРГУЕВ, П. А.: К вопросу о ляшских чертах в белорусской фонетике.– Труды Пост. комиссии по диалектологии русского языка. Вып. 9. 1927.
13. ФИЛИН, Ф. П.: Происхождение русского, украинского и белорусского языков. Л. 1972.
14. ШАХМАТОВ, А. А.: Очерк древнейшего периода истории русского языка. Энциклопедия славянской филологии, вып. II. Пгр. 1915.